для работы.Определяющим, на наш взгляд, является то, что за стенами Витебского народного художественного училища (института) отвлеченные идеи духовного обновлениями создания нового реальности беспредметным искусством натолкнулись на равнодушие, непонимание и нежелание своих современников тратить на них свои силы и время.

В случае Машкова это были две далеких друг от друга культуры – активно разрушающаяся властью, деградирующая, но еще жизнестойкая традиционная казачья культура и городская, столичная, новая социалистическая, представителем которой был художник Машков. Станичники не простили ему разоренных церквей, его городского вида, поведения, того, что он, вчерашний мужик, полугражданин станицы сегодня указывал им – казакам как жить, что делать. Он навязывал им чуждый мир, революционными методами разрушая старый, привычный.

Судьбы героев нашего повествования, казалась бы, иллюстрируют утопию о возможностях человека стать тем, что еще в античности называли «гением места». Трагический конец яркого начала.

Современные мировые процессы глобализации и интернационализации породили нового человека, свободного от многих традиционных жизненных ориентиров и ценностей. В «утиль истории» сдается семья, национальность, Родина, вообще любая привязанность, которая ограничивает внешнюю и внутреннюю свободу индивида. Но что тогда остается? Кем будут художник и его зритель?

Без творческих и нравственных исканий, упорного труда, жертвенности акт духовного творения человека не будет завершен. Индивид без любви к Родине, сопричастности и сопереживания ее судьбе и судьбам своих земляков, представляется нампосредственной, нищей духом личностью. Без Витебска Шагал и Малевич, и без Михайловской Машков, возможно бы и стали знаменитыми, но другими художниками. Другими были бы и мы, их земляки, «дух», и «образ места», в котором мы живем.


1. Волгоградский музей изобразительных искусств. – Ф.Машков И.И. Художник. Д. 25.
2. Галкова, О.В.«Писать и изображать что-то было невозможно»: из художников в культурные реформаторы / О. В. Галкова, О. Н. Савицкая //Художник И.И. Машков в искусстве, текстах, документах 1930-х годов. – М. : БуксМАрт, ВМИИ им. Машкова, 2014.
3. Государственная Третьяковская галерея. – Ф.112. Д. 214.
4. Сталинградская правда. – 1936.– 16 июня. – № 137.
5. Шатских, А.С. Витебск. Жизнь искусства. 1917–1922. / А. С. Шатских. – М.: Языки русской культуры, 2001.



**Гаўрылюк П.А.**


## СЯМЕЙНЫ АРХІЎ ЯК ФОРМА ЗАХАВАННЯ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ ПАМЯЦІ


*Ключавыя словы:* сямейныя архівы, мемуары, Заходняя Беларусь, гістарычная памяць.


На сённяшні дзень існуе шмат варыянтаў захавання гістарычнай спадчыны. Дадзеную функцыю выконваюць музеі, школы, архівы і іншыя ўстановы. Акрамя таго значны ўплыў ў дадзеным выпадку робяць матэрыялы асобных сямей, якія маюць пэўную гістарычную каштоўнасць. Менавіта ў сям'і людзі ўпершыню даведваюцца пра гістарычныя працэсы і падзеі на прыкладзе сваіх продкаў і сваякоў.

Таксама трэба адзначыць, што на афіцыйным ўзроўні паняцця «сямейны архіў» не існуе. Па адной з класіфікацыі архіваў Рэспублікі Беларусь можна вылучыць дзяржаўныя і недзяржаўныя архівы. Да першай группы адносяцца

рэспубліканскія, абласныя, занальныя, гарадскія, тэрытарыяльныя архівы і ЗАГС, а да другой – архівы камерцыйных прадпрыемтв, арганізацый, партый, а таксама ўласныя і канфесіянальныя. Самым блізкім да «сямейнага архіва» можна лічыць ўласны, ці «архіўны фонд уласнага паходжання», які складаецца з дакументаў жыццядзейнасці асобы, сям'і ці рода [1].

У любога архіўнага фонда, у тым ліку і сямейнага, ёсць фондаўтваральнік. Складанасць вылучэння фондаўтваральніка архіўнага фонда асобнай сям'і заключаецца ў тым, што ў сямейным архіве аб'ядноўваюцца матэрыялы дзьвух сямей: з боку маці і бацькі. Акрамя таго частка інфармацыі можа захоўвацца ў іншых сваякоў і іх сем'ях, але мець агульнае дачыненне да патомкаў.

Разглядаючы сямейны архіў аўтара можна заўважыць, што большая частка матэрыялаў належала продкам па бацькоўскай лініі. Ад маці ёсць фотаальбом, дзе самы ранні фотаздымак датуецца канцом XIX стагоддзя, а таксама засведчаныя копіі дакументаў з Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці, якія дазваляюць даведацца пра месца жыхарства продкаў аўтара ў першай палове XX стагоддзя. Іншыя матэрыялы, у тым ліку ардэна, паштовыя лісты і больш раннія фотаздымкі захоўваюцца ў блізкіх сваякоў і аўтар мае да іх вольны доступ.

Што датычыцца бацькоўскай палавіны архіва, тут асноўным фондаўтваральнікам лічыцца дзядуля аўтара – Гаўрылюк Сяргей Васільевіч. Ад яго застаўся самы вялікі шэраг інфармацыі, які складаецца з фотаальбома з фотаздымкамі пачатка XX стагоддзя і запісаных успамінаў. Асобую цікаўнасць выклікаюць менавіта ўспаміны, якія ў сям'і аўтара называюць «мемуарамі». Мемуары – гэта жанр літаратурнага твора аб мінулым у форме апавядання ўдзельніка розных падзей уласнага і грамалскага характару, аснову зместа якога, у асноўным, вызначае памяць аўтара [2, с. 32]. Пры даследванні мемуараў неабходна ўлічваць ролю асобы іх аўтара ў пэўным гістарычным працэсе і мэту іх напісання. У дадзеным выпадку гутарка ідзе пра аўтабіяграфічныя звесткі і ў самым пачатку іх аўтар тлумачыць, што вырашыў запісаць сваі ўспаміны, таму што шкадуе, што сам у свой час не пацікавіўся аб мінулым старэйшага пакалення, і вырашыў захаваць такім чынам сваю памяць для патомкаў. Гаўрылюк А.С. не прэтэндаваў на іх публікацыю, таму апісваў усё шчыра і падрабязна, а пачаў сваю працу ў 2007 годзе.Што датычыцца структуры мемуараў, яны складаюцца з пяці сшыткаў, кожны з якіх адпавядае пэўнаму этапу ў жыцці іх аўтара:

1. Дзяцінства і юнацтва.
2. Юнацтва і маладосць.
3. Маладосць.
4. Сталы ўзрост.
5. Сталасць і старасць.

Менавіта першая частка ўяўляецца самай цікавай і інфарматыўнай ў гістарычным плане. У ёй Гаўрылюк С.В. зафіксаваў успаміны з ранняга дзяцінства (ён нарадзіўся ў 1935 годзе, а самыя раннія запісы з уласнай памяці аўтара тычацца 1938 года). Так як ён нарадзіўся ў вёске сучаснага Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці ў запісах можна знайсці прыблізны план двара з пабудовамі, іх назвы на мясцовым дыялекце, колькасць хатніх жывёл у сям'і і кароткую інфармацыю пра кожнага члена сям'і і нават некаторых аднасяльчан. Гэта дазваляе скласці ўяўленне аб звычайным жыцці і побыту людзей, якія жылі амаль сто гадоў таму. Акрамя таго прысутнічаюць успаміны пра пераход улады ад палякаў да саветаў (пасля 17 верасня 1939 года Заходняя Беларусь перайшла ад Польшчы ў склад БССР), першыя спробы калектывізацыі ў вёске і стаўленне

мясцовых жыхароў да новай улады. Далей аўтар успамінае пра нямецкі акупацыйны рэжым на вёске падчас Вялікай Айчынай вайны, дзейнасць партызан, угон людзей у Германію і працягласць баявых дзеянняў напрыканцы вайны. Не менш цікава ў першай частке апісана і вяртанне савецкай улады, складанасці пасляваеннага аднаўлення на вёсцы, агітацыя да ўступлення ў калгасы і ўвядзенне школьнай адукацыі савецкага ўзору.

Неабходна адзначыць, што сам Гаўрылюк С.В. непасрэдна у саміх мемуарах папярэджваў, што пачаў іх пісаць у 72-гадовым узросце, таму найбольш ранняя ўспаміны могуць быць недакладнымі і ўвогуле ў дзяцінстве ён мог складаць сваё меркаванне аб чымсці на падставе размоў дарослых і ўласнага эмацыянальнага ўражання.

Таксама да сямейнага архіва аўтара можна аднесці схемы радаводаў бабулі і дзядулі па бацькоўскай лініі, складзеныя блізкім сваяком. Яны захоўваюцца ў электронным варыянце і ўяўляюць сабой генеалагічную схему з імёнамі і гадамі жыцця прамых продкаў і іх братоў і сясцёр. Дадзеная схема была выкарыстана і дапоўнена аўтарам дадзенага артыкула пры складанні сіметрычнага радавода з генеалагічнымі карткамі на кожнага продка сям’і пры падрыхтоўке заліковага праэкта для курса дапаможных гістарычных дысцыплін на другом курсе гістарычнага факультэта БрДУ імя А.С. Пушкіна.

Акрамя таго аўтар актыўна праводзіць работу па збору вусных ўспамінаў сваякоў, якія ведаюць падрабязнасці аб светапогляду, дзейнасці і характару некаторых продкаў, што дазваляе скласці больш поўнае ўяўленне аб гістарычнай і культурнай спадчыне сваёй сям’і.

Такім чынам можна зрабіць вынік, што стварэнне і захаванне сямейнага архіва з’яўляецца найбольш даступным спосабам захавання гістарычнай памяці на ўзроўні мікрагісторыі і неабходным элементам выхавання маладога грамадзяніна і патрыёта. Таксама трэба ўлічваць, што сямейныя архівы непасрэдна звязаны з часам іх стварэння і адлюстроўваюць яго.


1. Архівы Беларусі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: https://archives.gov.by/. – Дата доступа: 08.10.2023.
2. Приймак, Н. И. Мемуары, дневники, письма как исторический источник: учебное пособие/ Н. И. Приймак, К. О. Валегина. – СПб : ЛЕМА, 2018. – 72 с.



**Даўматовіч К.Д.**


## КАЛІ З’ЯВІЛАСЯ ВЁСКА ПАГОСТ САЛІГОРСКАГА РАЁНА НА СТАРОНКАХ ДАКУМЕНТАЎ: 1449 VS 1499 гг.?


*Ключавыя словы:* Салігорскі раён, Пагост, Вялікае Княства Літоўскае, Алелькавічы, лакальная гісторыя, краязнаўства, дакументальны помнік.


Пытанні захавання і выкарыстання дакументальных помнікаў заўсёды з’яўляліся фундаментальнымі ў гістарычнай навуцы. У залежнасці ад таго, як навуковец выкарыстоўваў дакумент прадвызначаюцца высновы даследавання. Аднак час ад часу нават і ў самых вялікіх даследчыкаў спрацоўвае так званы «чалавечы фактар». Адна з падобных памылак стала асновай для нашага пытання: калі з’явілася вёска Пагост сучаснага Салігорскага раёна на старонках дакументаў: у 1449 ці ў 1499 гг.? Удакладненню дадзенага пытання і прысвечаны гэты тэкст.

У 1892 г. гісторыкам М. К. Любаўскім было апублікавана даследванне «Областное деление и местное самоуправление Литовско-Русского государства ко